*І. У. Таяноўская*

# ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ ПА РЫТОРЫЦЫ ДЛЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ 1–21 05 01 БЕЛАРУСКАЯ ФІЛАЛОГІЯ ПА ТЭМЕ "ГІСТОРЫЯ КРАСАМОЎСТВА Ў БЕЛАРУСІ"

1. Знакамітая алегарычная карціна веснавога адраджэння прыроды даецца Кірылам Тураўскім у такім творы, як: 1) "Слова на Пасху"; 2) "Слова на антыпасху"; 3) "Слова аб расслабленым"; 4) "Прытча пра душу і цела"; 5) "Слова на сабор святых айцоў".

2. "Пасланне да прасвітэра Фамы" належыць: 1) Кірыле Тураўскаму; 2) Феадосію Пячэрскаму; 3) Кліменцію Смаляцічу; 4) мітрапаліту Іларыёну.

3. Бясспрэчна належнай Кірыле Тураўскаму лічыцца такая колькасць слоў, як: 1) 8; 2) 23; 3) 30; 4) 89.

4. Творчасць Кліменція Смаляціча прыходзілася на: 1) XI ст.; 2) XII ст.; 3) XIII ст.; 4) XIV ст.

5. Ф. Скарына вучыўся рыторыцы ў складзе сямі свабодных мастацтваў: 1) у Кракаве; 2) у Падуі; 3) у Празе; 4) у Вільні.

6. Ф. Скарына раіць навучацца рыторыцы па такой частцы Бібліі, як: 1) кніга Іова; 2) кніга "Юдзіф"; 3) кнігі цара Саламона; 4) кнігі Царстваў.

**7.** Паплечнікам Вітаўта Вялікага з'яўляўся: 1) Л. Сапега; 2) А. Волан; 3) Р. Цамблак; 4) П.Скарга; 5) С. Зізаній.

8. Аўтарам прамовы на Варшаўскім сейме з прапановай зацвердзіць Статут Вялікага княства Літоўскага з'яўляецца: 1) Л. Сапега; 2) П. Скарга; 3) А. Волан; 4) І. Пацей.

9. Прадстаўніком стылю "пляцення славес" быў наступны прамоўца: 1) Кірыла Тураўскі; 2) Рыгор Цамблак; 3) Францыск Скарына; 4) Леў Сапега.

10. Пачэснае званне і славу "віленскага залатавуста" у свой час атрымаў такі непераўзыдзены майстар красамоўства, як: 1) С. Будны**;** 2) П. Скарга; 3) М. Сматрыцкі; 4) Л. Карповіч.

11. Знакамітая прамова, створаная ў гонар Л. Карповіча, належыць: 1) М. Сматрыцкаму; 2) І. Галятоўскаму; 3) Х. Філалету; 4) С. Зізанію.

12. Аўтарам кніг "Брэсцкі сінод" і "Абарона Брэсцкага сінода", якія прапагандуюць Брэсцкую унію і прыводзяць узоры прамаўлення ў яе

падтрымку, з’яўляецца: 1) С. Зізаній; 2) М. Сматрыцкі; 3) П. Скарга; 4) І. Пацей.

13. Перакладчыкам на беларускую мову палемічных твораў, аб’яднаных пад назвай “Апісанне і абарона сабору рускага Берасцейскага”, зрабіўся: 1) М. Сматрыцкі; 2) І. Пацей; 3) П. Скарга; 4) А. Волан.

14. Прыдворным прапаведнікам караля Жыгімонта ІІІ Вазы быў: 1) С. Зізаній; 2) М. Сматрыцкі; 3) П. Скарга; 4) І. Пацей.

15. Царкоўны прапаведнік, які ў XVI ст. у рэлігійна-палемічных мэтах зрабіў літаратурную перапрацоўку павучання святога Кірыла Іерусалімскага: 1) П. Скарга; 2) І. Пацей; 3) С. Зізаній; 4) Х. Філалет.

16. Аўтарам твора антыуніяцкай публіцыстыкі “Апакрызіс, альбо Адказ на кніжкі пра сабор Берасцейскі” з’яўляецца: 1) П. Скарга; 2) І. Пацей; 3) С. Зізаній; 4) Х. Філалет.

17. Аўтарам, які, звяртаючыся да польскага караля, параўноўваў лёс праваслаўных ва уніяцкія часы з турэцкай няволей, быў: 1) А.Філіповіч; 2) С. Зізаній; 3) Х. Філалет.

18. Аўтарства вядомай сатырычна-парадыйнай прамовы, што імітуе выступленне на Варшаўскім сейме 1609 г., прыпісваецца: 1) С. Зізанію; 2) Х. Філалету; 3) І. Мялешку; 4) І. Пацею.

19. Звярнуў на сябе ўвагу бацькі Пятра І – цара Аляксея Міхайлавіча – мастацкімі дэкламацыямі сваіх выхаванцаў: 1) Мялецій Сматрыцкі; 2) Сімеон Полацкі; 3) Феафан Пракаповіч; 4) Георгій Каніскі.

20. На вядомым партрэце адлюстраваны з кнігаю: 1) Іпацій Пацей; 2) Мялецій Сматрыцкі; 3) Сімеон Полацкі; 4) Феафан Пракаповіч.

21. Майстар духоўнага красамоўства Беларусі, прастату і захапляльную шчырасць прамоў якога адзначаў Аляксандр Пушкін: 1) Лявонцій Карповіч; 2) Мялецій Сматрыцкі; 3) Сімеон Полацкі; 4) Георгій Каніскі; 5) Феафан Пракаповіч.

22. У XVII–першай палове XVIII ст. у творах па рыторыцы і паэтыцы вядомых у Беларусі аўтараў-сучаснікаў пераважаў пункт гледжання, паводле якога: 1) паэтыка разглядалася як частка рыторыкі; 2) рыторыка разглядалася як частка паэтыкі; 3) рыторыка і паэтыка ўспрымаліся як самастойныя навукі.

23. Лічыцца, што адным з першых погляд на самастойнасць паэтыкі і рыторыкі стаў усталёўваць: 1) М. Сарбеўскі; 2) А. Загурскі; 3) Д. Каханскі.

24. Думка пра тое, што пераканаўчасць выказвання не ў шматслоўі, а ў праўдзе, належыць такому вядомаму ў Беларусі XVIII ст. аўтарытэту ў галіне рыторыкі і паэтыкі, як прафесар: 1) М. Сарбеўскі; 2) Ю. Барэйка; 3) Ф. Галянскі.

25. Эмацыянальна афарбаваны рытарычны зваротак “Братцы милые, дзеці Зямлі-маткі маей!” сустракаецца ў рытарычнай прозе: 1) К. Каліноўскага; 2) Ф. Багушэвіча; 3) М. Бурачка; 4) Цёткі.

26. Класічны перакрыжаваны паўтор “…Не народ зроблены для ронду, а ронд для народу” запазычаны з рытарычнай прозы: 1) К. Каліноўскага; 2) Ф. Багушэвіча; 3) М. Бурачка; 4) Цёткі.

27. Знакаміты рытарычны вокліч “Не пакідайце ж мовы беларускай, каб ня ўмёрлі!” належыць: 1) Ф. Скарыне; 2) К. Каліноўскаму; 3) Ф. Багушэвічу; 4) Цётцы.

28. З судовым красамоўствам была шчыльна звязана прафесійная дзейнасць: 1) Цёткі; 2) Ф. Багушэвіча; 3) А. Гаруна; 4) М. Гарэцкага.

29. Зварот да беларускага народу ў часы Вялікай Айчыннай вайны – узор мітынгова-агітацыйнага жанру сацыяльна-палітычнага красамоўства – быў падрыхтаваны: 1) Я. Купалам сумесна з Я. Коласам; 2) Я. Купалам; 3) Я. Коласам.

30. “Настаўнікам беларускай літаратуры” у сваёй юбілейнай прамове назваў Л. Талстога: 1) Я. Купала; 2) Я. Колас; 3) П. Броўка.

31. Правільным з’яўляецца сцверджанне, што: 1) Я. Колас выступаў на адкрыцці помніка Я. Купалу; 2) Я. Колас адмовіўся выступіць на адкрыцці помніка Я. Купалу; 3) Я. Колас не змог выступіць на адкрыцці помніка Я. Купалу.

32. “Самотнай зоркай” на небасхіле беларускай паэзіі называе М. Багдановіча ў сваёй прамове: 1) М. Танк; 2) У. Караткевіч; 3) П. Панчанка; 4) Я. Брыль.